## Да юбілею Таццяны Каламійцавай

### *2 жніўня спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння дырыжора, народнай артысткі Беларусі Таццяны Каламійцавай*

"Дырыжор павінен музіцыраваць. І павінен музіцыраваць разам з артыстамі аркестра. І павінен прымусіць музіцыраваць публіку, Так, так, публіку!" – гэтыя словы славутага нямецкага дырыжора Герберта Караяна з упэўненасцю можна аднесці да творчасці народнай артысткі Беларусі Таццяны Міхайлаўны Каламійцавай. Прафесія дырыжора традыцыйна лічыцца нежаночай, бо яна патрабуе велізарнага тэмпераменту, магутных душэўных сіл, здольнасці падпарадкаваць сабе аркестр і павесці яго за сабой. Час змяняе звыклыя ўяўленні, і Таццяна Каламійцава была адной з нешматлікіх у былым Савецкім Саюзе (і ў свеце) жанчын-дырыжораў.

Нарадзілася яна незадоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі. З шасці гадоў вучылася іграць на фартэпіяна. Заняткі музыкай не займалі тады галоўнае месца ў жыцці дзяўчынкі, і таму яна паступіла на аддзяленне графікі Адэскага мастацкага тэхнікума. У душы Каламійцава была меламанам (як і яе бацька – галоўны інжынер па рэканструкцыі будынка славутага Адэскага опернага тэатра), і дзяўчынка, седзячы на галёрцы, перагледзела ўсе спектаклі, што ішлі на сцэне. Адным з самых яркіх уражанняў яе юнацтва стала опера "Гугеноты" Дж. Меербера, якая і вызначыла будучы лёс Каламійцавай: яна паступіла ў Адэскую кансерваторыю. У 1936 г. Таццяна Міхайлаўна скончыла яе і пачала працаваць у оперным тэатры Вінніцы, а потым вытрымала ўсесаюзны конкурс і стала асістэнтам славутага А. Гаука – мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра СССР, буйнейшага калектыву краіны. На той час ёй было толькі дваццаць тры гады… Праз год у канцэрце Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра СССР Таццяна Каламійцава ўжо дырыжыравала сваёй першай праграмай, якая складалася з твораў Л. Бетховена. Потым яна вучылася ў аспірантуры Маскоўскай кансерваторыі і адначасова кіравала сімфанічным аркестрам Ленінградскай філармоніі. Дырыжорская манера Каламійцавай вызначалася стрыманасцю і высакародствам. Гэта вылучала яе з ліку многіх маладых дырыжораў. Пра Каламійцаву шмат пісалі, на яе канцэртах заўсёды быў аншлаг, аркестр запрашалі на гастролі па краіне. Усё здавалася такім трывалым, надзейным, але раптам пачалася вайна…

Боль ад падзей на фронце, работа на будаўніцтве аб'ектаў, голад, пастаянныя пераезды, эпізадычная праца па спецыяльнасці, разлука з блізкімі, сваякамі… Але была і сустрэча ў Каўрове з беларускім музычным тэатрам, куды Каламійцаву запрасілі балетным дырыжорам. Адразу пасля вызвалення Беларусі яна ўзначаліла аркестр Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР і заставалася яго дырыжорам амаль да апошніх дзён свайго жыцця.

Ужо першыя дэбютныя тэатральныя работы Каламійцавай вызначаліся творчым пошукам, перакanaўчай інтэрпрытатарскай канцэпцыяй. У рэпертуары тэатра з'явіліся оперы "Яўген Анегін" і "Пікавая дама" П. Чайкоўскага, "Аіда" і "Трубадур" Дж. Вердзі, "Багема" Дж. Пучыні і "Севільскі цырульнік" Дж. Расіні, "Лаэнгрын" Р. Вагнера і "Заручыны ў манастыры" С. Пракоф'ева, балеты "Лебядзінае возера", "Спячая красуня", "Шчаўкунок" П. Чайкоўскага", "Жызэль" А. Адана і "Бахчысарайскі фантан" Б. Асаф'ева. Дзякуючы яе намаганням на беларускай сцэне з'явілася фантастычная опера Ж. Афенбаха "Казкі Гофмана" і "Арэстэя" С. Танеева. Беларуская музычная крытыка ў свой час адзначала, што ў трактоўцы класікі характэрным для Каламійцавай з'ўлялася імкненне вызваліць партытуру ад штампаў, прачытаць і зразумець яе па-новаму. Яшчэ адна цікавая старонка творчай біяграфіі Т. Каламійцавай – дырыжыраванне і музычнае кіраўніцтва беларускімі нацыянальнымі творамі. Сярод іх былі "Аповесць пра каханне" і "Палымяныя

сэрцы” В. Залатарова, “Падстаўная нявеста” Г. Вагнера, “Выбранніца” і “Тыль Уленшпігель” Я. Глебава, опера “Алеся” Я. Цікоцкага.

Каламійцава бліскуча дырыжыравала самымі складанымі творамі. Яна, як кажуць музыканты, заўсёды трымала не галаву ў партытуры, а партытуру ў галаве, і таму ясна бачыла ўсё, што адбываецца на сцэне. Гэтая творчая свабода дазваляла Каламійцавай дыхаць з выканаўцамі адным дыханнем, і часам нават здавалася, што ў пластыцы дырыжора адлюстроўваецца тое, чым жыве сцэна. Яе рукі – чуйныя, моцныя, гнеўныя, летуценныя, задумлівыя, здзіўленыя, уладарныя, разважлівыя, апантаныя, страсныя, засяроджаныя, адухоўленыя, палётныя… Пяшчотнае піяна і магутнае паўнагучнае фортэ, распеўнае адажыо і імклівае алегра – усё было падуладна ім. Упэўнена вялі слухачоў па акіяне музыкі рукі цудоўнага дырыжора. Шкада, што пра Таццяну Міхайлаўну Каламійцаву даводзіцца казаць у мінулым часе, але яе творчасць стала часткай гісторыі беларускай музычнай культуры, сапраўднай тэатральнай эпохай…

Матэрыял падрыхтаваны ў 2004 г.